І. Л. Калечыц

Графіці келлі прападобнай Еўфрасінні ў Спаса-Праабражэнскай царкве г. Полацка: першая спроба абагульнення і інтэрпрэтацыі

Комплекс графіці Спаса-Праабражэнскай царквы г. Полацка на дадзены момант утрымлівае больш за дзве тысячы зафіксаваных і прачытаных надпісаў. Больш за тысячу з іх знаходзіцца ў ніжнім ярусе царквы: у алтары, аркасоліях, на сценах і слупах. Верхні ярус уключае ў сябе надпісы на хорах і ў келлях.

У адрозненне ад лесвіцы, дзе яшчэ вядуцца рэстаўрацыйныя работы па ачышчэнні фрэсак ад алейнай фарбы, келлі расчышчаны практычна цалкам. Цяпер мы можам зрабіць папярэдні аналіз надпісаў: вызначыць іх змест, моўны склад, храналагічныя рамкі.

Для таго, каб мець уяўленне аб размяшчэнні надпісаў у келлі прападобнай Еўфрасінні, неабходна даць невялікую гістарычную і архітэктурную даведку. Спаса-Праабражэнская царква г. Полацка была пабудавана ў XII ст. па ініцыятыве Еўфрасінні Полацкай. Падаецца слушным, што ёю была вызначана не толькі праграма роспісу храма, але і праект яго пабудовы. У заходняй сцяне царквы знаходзіцца лесвіца, якая вядзе на верхні ярус царквы, дзе змяшчаюцца хоры і дзве келлі, адна з якіх, паўднёвая, належала прападобнай, а другая, паўночная, — яе сястры Еўдакіі.

Келля прападобнай — своеасаблівы храм у мініяцюры, дзе адбываліся памінальныя богаслужэнні (аб чым сведчыць Дэісус у сярэдняй зоне алтарнай прасторы)[1]. Аднак, у адрозненне ад храма, мы не можам вылучыць тут нефы, алтарную частку і г. д. У папярэчным разрэзе келля прадстаўляе сабой крыж, таму Ю. І. Маліноўскім было прапанавана называць часткі гэтага крыжа рукавамі[2]. Такім чынам, у келлі чатыры рукавы. Разгледзім іх асаблівасці. У заходняй сцяне заходняга рукава знаходзіцца ўваход, на паўднёвай — кцітарская фрэска, у паўночнай — невялікая выемка-ніша. У паўночнай сцяне паўночнага рукава ёсць крыжападобнае акно, ва ўсходняй — ніша. Ва ўсходняй сцяне ўсходняга рукава — акно на ўзроўні дыяканніка. У паўднёвай сцяне паўднёвага рукава — знешняе акно храма. Роспіс келлі Еўфрасінні Полацкай, па сведчанні рэстаўратараў, быў выкананы пасля смерці прападобнай і датуецца XIII ст. Матыў роспісу — жыццё Еўфрасінні Александрыйскай, нябеснай патранэсы Еўфрасінні Полацкай. Келля Еўдакіі не распісана, там знаходзяцца толькі фрагментарныя спробы роспісу, напрыклад, галава анёла на паўночнай сцяне ўсходняга рукава. Шырыня сцен рукавоў келлі невялікая і вагаецца ад сямідзесяці да ста сантыметраў. На паверхню сцен у абедзвюх келлях нанесена велізарная колькасць надпісаў, якая па шчыльнасці можа быць параўнана толькі з графіці сцен праёмаў паміж дыяканнікам і алтаром, ахвярнікам і алтаром. Самая маленькая колькасць надпісаў на адной сцяне рукава — трыццаць два, самая вялікая — больш за сто. Графіці наносіліся на вышыню да трох метраў ад сучаснага ўзроўню падлогі.

Чым выклікана такая шчыльнасць надпісаў, кім яны наносіліся і ў які час? Адна з асноўных задач даследавання графіці — вывучэнне графікі літар, вызначэнне зместу і датаванне надпісаў. Раней выказваліся думкі, што надпісы ў келлі (і ў астатняй прасторы храма) наносіліся шкалярамі полацкага езуіцкага калегіума[3]. Гэтая гіпотэза ў асноўным пацвердзілася. Хаця пэўны працэнт складаюць надпісы зусім іншага роду.

Яшчэ раз нагадаем размеркаванне графіці ў прасторы царквы. У алтары, ахвярніку, на паўночна-ўсходнім, паўднёва-ўсходнім і паўночна-заходнім слупах, паўночнай сцяне дыяканніка, аркасоліі знаходзяцца пераважна кірылічныя надпісы. На паўднёва-заходнім слупе, астатняй прасторы дыяканніка, келлях і хорах, а таксама, меркавана, на сценах лесвіцы большасць надпісаў выкананы лацініцай. З'яўленне надпісаў на кірыліцы і лацініцы абумоўлена гістарычнымі працэсамі, якія знайшлі адлюстраванне ў розным моўным складзе надпісаў. Першапачаткова, з моманту пачатку богаслужэння ў храме, г. зн. з XII ст., наносіліся кірылічныя надпісы. Самыя раннія надпісы на лацініцы звязаны з уваходам у Полацк войскаў Стэфана Баторыя ў 1579 г. З'яўленне больш позніх надпісаў такога кшталту звязана з перадачай Спаскага манастыра Ордэну езуітаў у 1582 г.[4] У гэты час

[1] Сарабьянов В. Д. Спасо-Преображенская церковь Евфросиньева монастыря и ее фрески: 2-е изд., доп. Москва, 2009. С. 211.

[2] Аўтар выказвае шчырую падзяку мастаку-рэстаўратару Ю. І. Маліноўскаму за дапамогу і падтрымку ў рабоце.

[3] Володихин Д. М. Повесть в камне // Полоцкий вестник. 1993. № 1 (2). С. 65–66.

[4] Гребенщикова А. А. и др. Поновления древней росписи Спасо-Преображенской церкви Евфросиниева монастыря в Полоцке. Проблема сохранения и музеефикации поздних записей // История и археология Полоцка и Полоцкой земли: материалы VI Международной научной конференции (1–3 ноября 2012 г.). Ч. 2. Спасо-Преображенская церковь в Полоцке: История. Архитектура. Живопись. Полоцк, 2013. С. 19.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пачынаецца настойлівае запаўненне прасторы келляў, слупоў і хораў аўтографамі езуцкіх шкаляроў. Безумоўна, і для гэтага часу характэрна некаторая частка надпісаў на кірыліцы. Часткова іх з'яўленне звязана з перадачай царквы праваслаўным пасля ўваходу ў Полацк войскаў Аляксея Міхайлавіча ў 1654 г. Самыя познія надпісы на кірыліцы і лацініцы датуюцца 1832 г., але іх няшмат. Пасля адбылося панаўленне храма і роспіс яго алейнымі фарбамі ў 1833 г., што, па сутнасці, закансервавала і фрэскі, і графіці.

Асноўную колькасць графіці келлі прападобнай складаюць аўтографы шкаляроў езуіцкага калегіума. Гэтыя надпісы можна падзяліць на некалькі груп, якія характарызуюць розныя віды афармлення надпісаў.

Першая і найменш інфарматыўная група — гэта імёны. Яна можа даць хіба што цікавую інфармацыю па антрапаніміцы XVI–XVII ст. ды лінгвістычны матэрыял, які тычыцца перадачы на пісьме тагачаснай мовы.

Часцей на сценах келлі сустракаецца спалучэнне імя і прозвішча, напрыклад: «Stephanus // Biesiadzec, Markianus // Woiciehowicz, Ioan // Kaluski» і г. д. Такія графіці можна датаваць толькі па графіцы літар або шукаць аналагічныя надпісы, у якіх побач запісана дата. Датаванне можа быць падмацавана ўпамінаннем аўтараў надпісаў у іншых пісьмовых крыніцах.

Надпісы, якія будуюцца па схеме «Hic fuit імя прозвішча» («Тут быў ...»), не прадстаўлены на сценах келлі ў такой вялікай колькасці, як у ніжняй прасторы храма, дзе вялікая колькасць надпісаў такога тыпу знаходзіцца на слупах (асабліва на паўднёва-заходнім).

Сярод іншага на сценах келлі сустракаецца пэўная колькасць жаночых імёнаў. Іх зусім няшмат. Можна лічыць верагодным, што імёны напосіліся як самімі дзяўчатамі, так і хлопцамі. Так, напрыклад, цікавы надпіс, які складаецца з трох радкоў, знаходзіцца на паўднёвай сцяне ўсходняга рукава: «Mathias // Sabina // 1604». Можна дапусціць, што імёны былі нанесены хлопцам, які меў сімпатыю да нейкай Сабіны. Самы вялікі надпіс, які прадстаўляе сабой шматсастаўнае жаночае імя, нанесены над нішай на ўсходняй сцяне паўночнага рукава. Імя чытаецца як «Apolonia Cechanowecka woiewodzanka Ms... auska // ... svi... aska». Жаночыя імёны, запісаныя лацінкай, сустракаюцца і на астатняй прасторы царквы. Напрыклад, на хорах запісаны імёны «Kristina», «Zofia» і «Beata Tyshkewichova», на сцяне праёма паміж алтаром і дыяканнікам — імёны «Beatrix» і «Kristina».

Самыя каштоўныя надпісы келлі — гэта тыя, якія маюць даціроўку. Яны ўтрымліваюць імя, прозвішча і дату напісання. Па-першае, такія надпісы даюць магчымасць азначыць асобу ў прасторы. Некаторыя надпісы можна суаднесці з іншымі пісьмовымі крыніцамі. Па-другое, даты даюць магчымасць азначыць рамкі доступу ў келлю. Самыя ранніе надпісы датуюцца 1579 г., што, безумоўна, звязана з уступленнем у Полацк войскаў Стэфана Баторыя. Прыкладам такога надпісу можа служыць графіта на заходняй сцяне паўднёвага рукава: «Ro 1579 // Pan Bogna... wicz // tu (był)». Аднак такіх надпісаў няшмат. Пэўная частка надпісаў XVI ст. належыць ужо шкалярам калегіума: напрыклад, «Benedictus (z) Broda Anno 1589». Нам падаецца слушным, што тэрыторыя Спасаўскага манастыра стала выкарыстоўвацца ордэнам не адразу пасля перадачы, на што ўказвае склад надпісаў 1579–1584 гг. Па сведчанні Т. Б. Бліновай, у год адкрыцця езуіцкай школы ў Полацку (1581) там налічвалася ўсяго 5 хлопчыкаў[5]. На сценах келлі ёсць такія графіці, як «Gerdt Faget // Ano 83 (rier?) 24 au...», палеаграфія надпісу дазваляе датаваць яго 1583 г. Надпісы да 1584 г. ёсць і на знешніх сценах алтара. Так, справа ад алтарных врат знаходзіцца цэлы спіс імёнаў і прозвішчаў, якія датуюцца 1584 г., у іх складзе аўтографы «Luder Ronneken» і «Iochim Sonenbom», якія сустракаюцца таксама ў алтары і на слупах. Магчыма, гэта не аўтографы шкаляроў, а графіці воінаў — наёмнікаў Стэфана Баторыя. На карысць гэтага сведчыць тое, што пазней у масе шкалярскіх графіці не сустракаецца імёнаў і прозвішчаў нямецкага і галандскага паходжання. Сустракаюцца і фрагментарныя датаваныя надпісы, якія не змяшчаюць імён: «Anno 1592», «... 1589», «Roku 1581».

Значна большая колькасць графіці з'яўляецца ў XVII ст. Часовыя рамкі можна азначыць наступным чынам. Ніжняя часовая планка — першае дзесяцігоддзе XVI ст., а дакладней, 1603–1604 гг. Пэўную колькасць з іх складаюць кірылічныя надпісы. Верхняя планка — надпісы 40-х гг. XVIII ст. У келлі Еўфрасінні Полацкай большасць надпісаў належыць да XVI ст., а ў келлі яе сястры надпісаў XVII ст. значна больш. Гэта наводзіць на думку, што ў пэўны час нанясенне графіці дасягнула свайго піку, пасля чаго доступ туды быў перапынены. З чым дакладна гэта звязана, зараз вызначыць цяжка. Можна разгледзіць некалькі версій. Памяншэнне колькасці графіці можа быць звязана з прадухіленнем псавання маёмасці (праз нанясенне хуліганскіх, па сутнасці, над-

[5] Блинова Т. Б. Иезуиты в Беларуси. Роль иезуитов в организации образования и просвещения. Гродно, 2002. С. 55.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пісаў) шляхам забароны доступу ў храм. Так, надпісы XVIII ст. у келлі прападобнай наносяцца, але іх менш, чым ў келлі Еўдакіі. Памяншэнне надпісаў можа быць звязана з правядзеннем набажэнстваў у храме, пераасвечаным у касцёл. Як варыянт, можна разгледзіць забарону доступу менавіта ў келлю прападобнай, дзе знаходзіўся нейкі архіў ці сховішча пэўных каштоўнасцяў. Магчыма, гэтым часам датуецца ўстаноўка рашотак у акне паўночнай сцяны, знешнім акне паўднёвай сцяны і дзвярэй на ўваходзе ў келлю.

У датаваных графіці часам сустракаецца ўпамінанне месяца — гэта ў асноўным канец вясны – пачатак лета, што пацвярджае думку аб тым, што доступ пікаляроў у келлю меў месца пераважна пад час вакацый, калі дзяцей вывозілі на адпачынак.

Датаваныя надпісы таксама каштоўныя тым, што па іх можна скласці палеаграфічныя табліцы, якія дадуць магчымасць фіксавання графікі літар і датавання недатаваных надпісаў. Увогуле, графіка літар графіці даволі цікавая і разнастайная. Што датычыцца вышыні літар, то яна ў сярэднім вагаецца ад 0,3 да 5 см. Надпісы рабіліся як у «зацішных» кутках, вельмі сціпла, маленькімі літарамі, так і ў тых месцах, якія больш на віду, што праяўляецца ў двух варыянтах. Гэта альбо вялікія літары ў выпадку больш бачнага месца, альбо графіці наносяцца на фрагменты дэкору: стужкі, лініі, якія раздзяляюць іканаграфічныя сюжэты, а таксама на німбы, што звязана з жаданнем вылучыць іх. Тады надпісы могуць размяшчацца стужкападобна, зверху ўніз, паўкругам і г. д. Што тычыцца каліграфіі надпісаў, гэта могуць быць як вельмі старанна напісаныя графіці, так і графіці неахайныя, запісаныя на хуткую руку. Адзін з добра выпісаных аўтографаў знаходзіцца на паўночнай сцяне заходняга рукава. Гэта надпіс Альберта Касперскага, які добра валодаў як пяром, так і інструментам, якім быў прадрапаны надпіс на сцяне. Магчыма, гэта была іголка. Тонкі надпіс з вычварна выпісанай літарай Е змешчаны над галовамі святых. Прадрапаны надпіс знаходзіцца справа, а злева ёсць надпіс аналагічнага зместу. Аднак гэта не графіта, а дыпінта — надпіс, выкананы тушшу або фарбай, ён мае светла-карычневы колер. Касперскі не толькі прыгожа пісаў, але і маляваў. Фарба, якой былі намаляваны вочы святых, сцерлася, і Альберт тонкімі лініямі «аднавіў» вочы, нос і валасы, якія, на яго погляд, павінны былі там быць.

Найбольш складана чытаныя надпісы выкананы неахайна, тонкімі лініямі. Аднак яны складаюць невялікую колькасць. Большасць надпісаў усё ж такі выкананы так, каб яны выглядалі больш-менш прыгожымі і чытэльнымі. Некаторыя са шкаляроў нават вылучалі свае

надпісы, каб аддзяліць іх ад астатніх. Яны выкарыстоўвалі рамкі, якія аздаблялі рысачкамі. Сярод такіх надпісаў вылучаецца графіта Мар'яша Міскевіча, датаванае 1648 г. (Рыс. 1). Да рамкі з абодвух бакоў ён дадаў даволі «пышныя» крылы. Гэта не адзіны малюнак на сценах келлі. Тут ёсць выява квадрата, чалавечых постацяў, а таксама гербаў. Герб «Ружа» — дзесяціпялёсткавая кветка (пяць востравугольных і пяць закругленых пялёсткаў) у полі барочнага шчыта — прарысаваны два разы: на заходняй сцяне паўночнага рукава і на ўсходняй сцяне ўсходняга рукава. Побач з гербамі — імёны і прозвішчы ўладальнікаў.

Датаваныя графіці змяшчаюць імёны асоб, вядомых па іншых пісьмовых крыніцах, у прыватнасці, па актавых кнігах полацкага магістрата. Такіх імёнаў знойдзена ўжо даволі шмат. Яны распаўсюджаны па ўсёй прасторы храма: на слупах, хорах, у дыяканіку. У келлі таксама маюцца надпісы такога кшталту[6]. Напрыклад, разгледзім графіта «Stefan Roszczewsky». Рашчэўскі Стафан (Стефан Рощевъский, Stephan Roszczewski) — сын бурмістра Базыля Рашчэўскага. У 1650 г. выступае як гадавы райца «рымскага боку». Прынёс прысягу і заняў месца райцы 1 студзеня 1650 г. У час вайны 1654–1667 гг. пакінуў Полацк. 23 сакавіка 1667 г. згадваецца як нябожчык.

Графіта з аўтографам «Petrus Rosz//czewsky 1635» знаходзіцца на паўночнай сцяне заходняга рукава. Рашчэўскі Пётр (Петр Рощевъский, Piotr Rozczewski), брат бурмістра Базыля Рашчэўскага, цесць месцкага пісара Тэадора Паўла Ельяшэвіча. У пачатку 1650 г. негадавы райца. Пасля смерці бурмістра Базыля Рашчэўскага фактычна заняў месца свайго брата. 4 мая 1650 г. актыкаваў канфірмацыйны ліст ваяводы і войта, выканаў прысягу на бурмістроўства і стаў гадавым бурмістрам «рымскага боку» 1650 г. У 1676 г. згадваецца як нябожчык. Пры жыцці валодаў адным з першых мураваных грамадзянскіх будынкаў Полацка — камяніцай на вул. Вялікай.

Графіта «Stanislaus Cyhanowicz» (Рыс. 2) знаходзіцца на ўсходняй сцяне паўночнага рукава. Цыгановіч Станіслаў (Stanisław Cyhanowicz, Stanisław Łukaszewicz Cychanowicz), верагодна, прыходзіўся сынам Лукашу Цыгановічу, які ў 1633 г. з'яўляўся магістрацкім ураднікам. Быў братам райцы Марціна Цыгановіча і цесцем райцы Лукаша Сітняновіча-Пятроўскага. У 1672–1678 гг. згадваецца як бурмістр (у 1676 г. — гадавы бурмістр). У 1682 г. згаданы як нябожчык.

[6] Аўтар выказвае шчырую падзяку М. Макараву за біяграмы аўтараў графіці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Графіта-аўтограф «Petrus Storymowicz A° 1651» знаходзіцца на ўсходняй сцяне паўночнага рукава. Старымовіч Пётр Казімір (Piotr Storymowicz, Piotr Kazimierz Storymowicz), верагодна, блізкі сваяк бурмістра Крыштафа Старымовіча. У 1672–1684 гг. згадваецца як полацкі лаўнік, пры гэтым у 1672, 1676, 1677, 1683 і 1684 гг. выконвае абавязкі лаўніка. У 1681 г. з'яўляўся адным з паслоў горада на сойм у Варшаву. Такім чынам, аўтографы гэтых людзей сведчаць на карысць іх навучання ў пэўны час у Полацкім езуіцкім калегіуме.

Кірылічных надпісаў няшмат, яны складаюць у келлі недзе 2–3% ад усёй колькасці надпісаў. Сустракаюцца надпісы, аналагічныя выкананым на лацініцы, — імя і прозвішча. Аднак, у адрозненне ад лацінскіх надпісаў, кірылічныя — часцей больш разгорнутыя і маюць зварот да Бога або сведчанне таго, что чалавек маліўся, калі знаходзіўся ў келлі. Напрыклад, графіта на паўночнай сцяне ўсходняга рукава чытаецца як «Карпъ Спи//ридовiи Ис//панъко по//клоняетца // Гдⷭу Богу» — «Карп Спірыдавіч Іспанка пакланяецца Госпаду Богу» (Рыс. 3). Па графіцы літар надпіс можна датаваць XVII ст. У два радкі запісана графіта на заходняй сцяне паўночнага рукава: «Спⷭи Гⷭи раба своего попа Иоа // Богдроусовичъ Андреевичъ» — «Спасі, Госпадзі, раба свайго Іаана Баярусавіча Андрэсвіча» (Рыс. 4). Некаторыя кірылічныя графіта, якія сведчаць аб наведванні чалавекам дадзенага храма, змяшчаюць словы, аналагічныя лацінскаму «manu propria» — «уласнай рукою». Такое графіта ёсць, напрыклад, на паўднёвай сцяне хораў. Акрамя рысунка Галгофы, там ёсць тры ўласнаручныя аўтографы Цімафея Міхайловіча (Міхайлоўскага). У келлі прападобнай таксама ёсць аўтографы гэтага чалавека. Аднак у якасці прыкладу надпісаў такога роду ў келлі мы прыводзім аўтограф іншага чалавека, змешчаны на ўсходняй сцяне паўночнага рукава (Рыс. 5): «Иванъ Федоровичъ Аловацынъ рукою власною писалъ року ⷭ҃ⷭ҃ⷯ҃ⷭ҃ // мⷣа июня // ⷯ҃ дня» — «Іван Фёдаравіч Алавашчын рукою ўласнай пісаў года 1606 месяца чэрвеня 20 дня».

Некаторыя надпісы прыадкрываюць у некаторай ступені інфармацыю аб тым, што вывучалася ў езуіцкім калегіуме. Так, можна меркаваць, што на пэўны час у калегіуме ўводзілася вывучэнне грэчаскай мовы. Гэта, на наш погляд, знайшло адлюстраванне ў напісанні свайго імя адным з навучэнцаў. Некалькі разоў, у тым ліку і на сцяне келлі, ён запісаў сябе як «Simon Simonides». Цікава, што іншым почыркам да гэтага надпісу былі даданы словы «puzanista, sociganista, bembenista», якія, магчыма, з'яўляюцца мянушкамі Сямёна. Геаметрычная фігура — ідэальна прачэрчаны квадрат, маецца на заходняй сцяне паўднёвага

рукава. Трэба адзначыць, што кругі, відавочна, прачэрчаныя цыркулем, сустракаюцца на ўсёй прасторы царквы. Іншыя матэматычныя практыкаванні знойдзены намі ў праёме паміж дыяканнікам і алтаром. Гэта складанне ў слупок. Цікава, што, у адрозненне ад сучасных вылічэнняў, замест адсутных лічбаў пад рысай, дзе мы пакідаем пустое месца, вучні калегіума запісвалі х-падобныя знакі. У келлі такіх прыкладаў вылічэнняў няма.

Частка надпісаў сведчыць непасрэдна аб alma mater шкаляроў — езуіцкім калегіуме. У графіці сустракаецца скарачэнне S. I. — «Societas Iesu». Гэта скарачэнне можа знаходзіцца каля імя, можа быць запісана побач з годам. Такія надпісы сустракаюцца па ўсёй прасторы храма, у прыватнасці на слупах і ў праёме паміж алтаром і ахвярнікам. Прыклад такога надпісу ёсць на паўднёвай сцяне нішы ва ўсходняй сцяне паўночнага рукава: «Antonius // Kotlinski S. I.esu 1731». Цікава, што, нягледзячы на скарачэнне — кропку пасля літары I, — слова напісана цалкам.

Аднак графіці келлі прадстаўляюць сабой не толькі імёны і прозвішчы. Такіх надпісаў зусім няшмат, яны нясуць цікавую інфармацыю. Так, напрыклад, на ўсходняй сцяне паўднёвага рукава знаходзім графіта: «Czasu obliężenia // Polocka // Eustafius» — «У час аблогі Полацка, Еўстафій» (Рыс. 6). Надпіс не мае года, па палеаграфічных даных можна датаваць яго XVII ст. Хутчэй за ўсё, надпіс быў нанесены ў 1654 г. пад час аблогі Полацка войскамі расійскага цара Аляксея Міхайлавіча. Почырк аўтара надпісу сведчыць аб пэўнай «напружанасці» пісаўшага: літары нахілены ў розныя бакі. Надпіс на паўднёвай сцяне заходняга рукава папярэдне чытаецца як «Mesca Polocka pod Moskva», ён зроблены ў той жа час.

Графіці келлі прападобнай могуць даць цікавую і карысную інфармацыю не толькі для гісторыі і дапаможных гістарычных дысцыплін, але і для рэстаўратараў. Так, напрыклад, распалажэнне графіці хораў паказала, што прастора паміж келлямі ў XVII ст. была высунута ўглыб царквы амаль на ўсю шырыню келляў. Рэстаўратарамі вылучана ў келлі прападобнай позняя тынкоўка XVII ст. Аднак застаўся невядомым дакладны час, калі яна была нанесена. Быў праведзены зандаж некаторых надпісаў, сярод якіх вылучана датаванае графіта, частка якога знайшла пад тынкоўку. Пасля зандажу графіта было прачытана цалкам: «Zakarias // Piotrowicz // 1649». Такім чынам, тынкоўка была нанесена пасля 1649 г. Яшчэ адзін датаваны надпіс, знойдзены на тынкоўцы ніжняга тыпу, чытаецца як «Budzko 1744». Гэта значыць, што тынкоўка

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

была пакладзена ў прамежак з 1649 па 1744 г. Мы лічым, што верагодным часам гэтых аднаўленчых работ мог быць рамонт храма перад асвячэннем яго праваслаўнай Царквой пасля прыходу ў Полацк войскаў цара Аляксея Міхайлавіча. Цікавае графіта, на наш погляд, звязанае з рамонтам храма, знаходзіцца не ў келлі, а над паўднёва-заходнім слупом. Яно чытаецца як «У Мінкея бацькі цвік прасіў». Маючы на ўвазе вышыню распалажэння надпісу, на якую маглі падняцца толькі будаўнікі, падаецца верагодным, што надпіс мог выканаць чалавек, які прымаў удзел у рамонце храма.

Акрамя таго, у келлі сустракаюцца два графіці з цікавай выявай. Апошняя ўяўляе сабой трохвугольнік, з вяршыні якога ў розныя бакі адыходзяць лініі, канцы якіх загібаюцца ўніз (Рыс. 7). Аналагічны знак сустракаецца таксама ў ахвярніку. Тут была выяўлена значная колькасць графіці, большасць з якіх кірылічныя, хаця невялікая частка позніх надпісаў зроблена лацінкай, прычым нярэдка паверх старых кірылічных графіці. І вось побач з адным з такіх позніх надпісаў, дзе чытаецца прозвішча «Korsak» (перад ім мелася яшчэ адно слова, але ад яго зараз захавалася толькі частка), бачна выява (Рыс. 8), вельмі падобная да вышэйапісанага знака з келлі. Цяпер ужо цяжка дакладна сказаць, ці надпіс з прозвішчам звязаны са змешчанай каля яго выявай, ці быў напісаны пазней паверх яе. Нядаўна даволі падобныя знакі былі выяўлены рэстаўратарамі і на старажытнай плінфе ў нартэксе храма. Дзве выявы тут паўтараюцца (Рыс. 9), трэцяя ж заўважна адрозніваецца ад іх (Рыс. 10), нагадваючы разгледжаны намі трохвугольны знак, але ў трохі стылізаваным варыянце ды з хвалістай лініяй побач. Усё гэта змушае меркаваць, што перад намі нейкі старажытны знак, звязаны, магчыма, з ахвярадаўцамі ці будаўнікамі манастыра.

Такім чынам, папярэдняе вывучэнне графіці келлі прападобнай Еўфрасінні Полацкай дае нам разнастайную інфармацыю, якая тычыцца антрапанімікі, моўных і графічных асаблівасцяў надпісаў, а таксама магчымасць пацвердзіць навучанне ў езуіцкім калегіуме гістарычных асоб, звесткі аб якіх зафіксаваны ў іншых гістарычных крыніцах. Даследаванне графіці можа аказаць пэўную дапамогу ў аднаўленні знешняга выгляду ўнутранай прасторы царквы.

Рыс. 1. Графіта Мар'яша Міскевіча, 1648 г.

Рыс. 2. Графіта-аўтограф Станіслава Цыгановіча



Рыс. 3. Графіта Карпа Спірыдавіча

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Рыс. 4. Графіта святара Іаанна Баярусавіча



Рыс. 5. Аўтограф Івана Фёдаравіча Алавашчына



Рыс. 6. Графіта пра аблогу Полацка

Рыс. 7. Графіта са знакам

Рыс. 8. Графіта з ахвярніка храма



Рыс. 9. Знак з плінфы ў нартэксе храма

Рыс. 10. Знак з плінфы ў нартэксе храма

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ